# СВЯТОЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ І ЯЕ ЎВАСАБЛЕННЕ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯКУБА КОЛАСА

## Вялікдзень як асэнсаванне вышэйшых каштоўнасцей быцця



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
культуры і мастацтва,
доктар культуралогіі, прафесар



**Л. К. Кухто,**
дацэнт кафедры культуралогіі Беларускага
дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
кандыдат культуралогіі

Творчае перайманне культурнага вопыту мінулых пакаленняў – неабходная ўмова для плённага развіцця любой нацыянальнай супольнасці. Аснову самабытнасці нацыянальнай культуры складае гістарычная спадчына, важным чыннікам якой з'яўляецца духоўны і матэрыяльны змест. Нацыянальная культура ў сваім ядры ўтрымлівае этнічныя элементы, якія ўяўляюць складаныя семіётыка-семантычныя ўтварэнні. Кожнае грамадства фарміруе своеасаблівыя інстытуты этнізацыі, аснову якіх складае тыражыраванне тэкстаў праз сродкі масавай інфармацыі, сістэму народнай адукацыі і прафесійную мастацкую культуру. Этнас праз гэтыя інстытуты паступова выпрацоўвае агульнанацыянальную свядомасць, захоўвае і канцэнтруе яе.

### Грамадская падзея ўрачыстага характару

Спецыфічнай формай духоўнага жыцця народа, формай мастацтва слова з'яўляецца літаратура. Яна выяўляе і ўвасабляе ў мастацкіх вобразах усю разнастайнасць чалавечага быцця, грамадскую свядомасць часу, багацце чалавечых характараў. М. М. Бахцін у працы «Эстэтыка славеснай творчасці» падкрэсліваў, што «літаратура – неадрыўная частка культуры, яе нельга зразумець па-за цэласным кантэкстам усёй культуры дадзенай эпохі» [1, с. 329].

Важкі ўклад у станаўленне і развіццё беларускай нацыянальнай літаратуры ўнёс Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч), 130-годдзе якога шырока адзначалася летась. Разам з Янкам Купалам, Максімам Багдановічам, Элаізай Пашкевіч, Змітраком Бядулям, Цішкам Гартным, Максімам Гарэцкім і іншымі пісьменнікамі ён удзельнічаў у стварэнні беларускай класічнай літаратуры, літаратурнай мовы, распрацоўваў усе асноўныя літаратурныя жанры.

Аналіз гісторыі беларускай літаратуры дазваляе сцвярджаць, што на ўсіх этапах яе развіцця этнакультурны кантэкст у той ці іншай ступені ўласцівы як паэтычным, так і празаічным жанрам. У разнажанравай творчай спадчыне Якуба Коласа таксама ўсебакова адлюстравана духоўная і матэрыяльная культура беларусаў. Так, у творах народнага паэта Беларусі вялікая ўвага надаецца асэнсаванню каштоўнасцей, сэнсаў і сімвалаў этнічнай культуры беларусаў, апісанню нацыянальных пасяленняў, вясковага і гарадскога жылля, гаспадарчых пабудоў, адзення і ежы, прылад працы і сродкаў руху, што ў сукупнасці і складае культуру жыццядзейнасці.

Шмат старонак у паэмах «Новая зямля», «Рыбакова хата», трылогіі «На ростанях», аповесці «Дрыгва», іншых празаічных і вершаваных творах прысвечана святочнай культуры беларусаў. У творчай спадчыне Якуба Коласа свята разглядаецца як інстытут культуры, што выступае як грамадская падзея ўрачыстага характару. Яно адасобленае ад паўсядзённасці і адбываецца ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вольны ад працы час. Гэты непрацяглы адрэзак часу мае асаблівую сувязь са сферай сакральнага і прадугледжвае максімальнае дачыненне да яе ўсіх удзельнікаў свята. Святочная культура беларусаў не толькі структурыравала і ўпарадкоўвала час гаспадарчай дзейнасці чалавека, але і вызначала пэўныя тэрміны правядзення свят. Такім чынам, на працягу многіх стагоддзяў склаўся комплекс народных, рэлігійных і дзяржаўных свят – многія з іх знайшлі адлюстраванне ў коласаўскіх творах.

## Семантызацыя артэфактаў свята

З грунтоўнасцю, паэтычнай дэталізацыяй аўтар падае малюнкі падрыхтоўкі да веснавога свята Вялікадня, якое існавала з часоў язычніцтва. З прыняццем славянамі хрысціянства яно было прымеркавана да падзей уваскрэсення раскрыжаванага Ісуса Хрыста і стала галоўным рэлігійным святам. Сакральнасць веліколнага свята вызначыла характар паэтычнай вобразнасці, стылю і мовы раздзела «Вялікдзень» у паэме «Новая зямля», многіх старонак трылогіі «На ростанях». Колас надзвычай ярка паказаў пачуцці людзей напярэдадні свята. Дзеці і дарослыя з нецярплівасцю чакалі гэтай падзеі, іх думкі задоўга да Вялікадня былі звязаны з сустрэчай яго. Увага дзяцей у пярэдадзень свята канцэнтруецца не на вучобе, а на падрыхтоўцы да яго: «У хаце вучням не сядзіцца – / Прайшла ахвота ў іх вучыцца... / А вучні кніжкі пахавалі / І ўсё Вялікадня чаклі» [2, с. 230–231].



Семантызацыя артэфактаў свята адбываецца ў працэсе падрыхтоўкі да яго, у святочных рытуалах і абрадах. Традыцыйная святочная культура беларусаў патрабавала актыўнага ўдзелу ў абрадах і рытуалах усіх суб'ектаў соцыуму. Таму выключна ўсе коласаўскія літаратурныя героі ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы да Вялікадня. Гэта тлумачыцца тым, што сродкамі святочнага дзейства ў памяці людзей узнаўляюцца вышэйшыя каштоўнасці быцця, з якімі звязаны сэнс існавання чалавека. Так, да веліколнага свята старанна рыхтаваліся ўсе члены сям'і лесніка Міхала: «Мужчыны загаддзя пабрылісь, / Вадою цёплаю памылісь, / Бо трэба ж ім было сабрацца / Паехаць у цэркву спавядацца» [2, с. 231]. Дзеці таксама ўключаліся ў працу па аздабленні навакольнага асяроддзя: «Алесь, Кастусь і Міхаліна – / Сама найшла на іх часіна – / На працу зранку выйшлі самі / І падмялі двор дзеркачамі; / Пясочку потым накапалі / І сцежкі ім панасыпалі» [2, с. 231].

Святы суправаджаліся цікавымі маляўнічымі рытуальна-абрадавымі дзеяннямі, якія грунтоўна ведаў паэт і шматфарбна апісаў у сваіх творах. Колас у кантэкст святочнага абрадавага дзейства ўключаў шырокае кола прадметаў. Гэта прылады працы, ежа, адзенне, хатняе начынне, цацкі, інтэр'ер хаты, царквы і інш. Яны разглядаліся ў тэкстах паэта як своеасаблівы сімвалічны код у структуры свята. Важнейшым атрыбутам вызначэння святочнага статусу з'яўляецца адзенне. Кожны ўдзельнік імкнуўся аздобіць сябе новай вопраткай, якая б адпавядала сутнасці таго альбо іншага свята, якая пераўвасабляла б у святочны дзень чалавека. Якуб Колас паказвае, што ўся сям'я Міхала ніколі не сустракала свята ў буднім адзенні. Вопратка заўжды была чыстая альбо ўвогуле новая: «Кабеты, дзеўкі, маладзіцы / Ідуць, плывуць да плашчаніцы / У хустках белых і чырвоных» [2, с. 235].

Надзвычай вялікая ўвага падчас веліколнага свята надавалася выбару прасторы, у якой яно адбывалася. Месцам правядзення свят маглі служыць луг, поле, вуліца, двор, лес і інш. Якуб Колас у сваіх творах надзвычай дэталёва азначыў ролю адкрытай і закрытай святочнай прасторы. Святочная прастора, як і самі людзі, падчас свят прыкметна пераўтваралася. Двор, хата прыводзіліся ва ўрачысты выгляд: «І ўжо пад вечар сама хата / Была прылучана да свята» [2, с. 231]. Цэнтрам вясковай святочнай прасторы таксама з'яўлялася царква, дзе, паводле меркавання пісьменніка, ажыццяўлялася яднанне яго літаратурных герояў з Богам праз сумесны ўдзел у таінствах. Вось чаму ў вялікую суботу яны імкнуцца да царквы: «А цэрква, макаўка святая, / Народу поўна, блескам ззяе» [2, с. 234]. Кампаненты веліколнай імпрэзы коласаўскія персанажы заўсёды асвячалі ў царкве. Функцыю святочнага атрыбуту на Вялікдзень, адзначаў Колас, выконваў шэраг прадметаў прыроднага паходжання. Так, у паэме «Новая зямля» царква аздаблялася галінкамі дрэў, кветкамі, сімвалічнымі царкоўнымі прадметамі: «У сяле на цэркві чуць абачна / Блішчыць




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліхтарык і мігае, / Дарожных погляд прыцягае» [2, с. 233], «Сярод царкоўкі плашчаніца / Стаіць між елачак зялёных» [2, с.235]. Такім чынам, святочная прастора ў вернікаў выступала як сфера эстэтычнага. Сузіранне яе шматколернасці, гарманічнай прыгажосці выклікала ў іх не толькі захапленне, святое трапятанне сэрца, але і прыносіла заспакаенне, давала жыватворныя сілы, надзеі на лепшую будучыню. Колас адзначаў, што ў перыяд рэлігійных свят людзі станавіліся больш спагадлівымі, уважлівымі адзін да аднаго, міласэрнымі. Так, у сям'і Міхала на Вялікдзень панавалі: «Лагоднасць, згода і павага / І вельмі сталая развага... Старыя, дзеці і падросткі, / І шуму тут не падымалі, / Як будным днём з-за кожнай косткі» [2, с. 231].

У паэтычных і празаічных коласаўскіх творах абрадавая ежа (чырвонае яйка, соль, пасха, кулічы і інш.) выступаюць пэўным ключом да разумення сутнасці святочных падзей. Стравы адпавядалі традыцыйным святочным атрыбутам усходніх славян. Дарэчы, большасць з гэтых страў дайшлі да нашых дзён. З выключным лірызмам паэт паказаў, напрыклад, сімвалічнае значэнне велікоднага снядання. Галоўнай рытуальна-абрадавай стравай было чырвонае яйка, асвечанае ў царкве. Размаляваныя рознымі ўзорамі курыныя яйкі (пісанкі, маляванкі) з прыняццем хрысціянства ўвайшлі ў абрад святкавання Вялікадня. У Чырвоную суботу ў царкве асвячалі не толькі чырвоныя яйкі, але амаль усе святочныя стравы. Гэты рытуальна-абрадавы аспект знайшоў адлюстраванне ў паэме «Новая зямля»: «Нясуць жанкі, нясуць мужчыны / Кашы, каробкі, паўасьміны / І ставяць у рад на цвінтары / Усе велікодныя дары» [2, с. 235]. Раніцай, пакуль за святочным сталом не разгавеюцца велікодным яйкам, есці нічога іншага нельга. Яйка дзялілі на столькі частак, колькі ў сям'і было чалавек: «І гуртам яйкі ачышчаюць, / І па кусочку іх бяруць, / Крыху падсольваюць, ядуць» [2, с. 236].

Святочны стол у гэты дзень быў надзвычай разнастайны, багаты. Напярэдадні свята беларусы гатавалі шмат страў, асабліва з мяса, пяклі кулічы, рабілі пасху. Велікодны стол настаўніка Тараса пісьменнік дэталёва апісаў у трылогіі «На ростанях»: «Пасярэдзіне пакоя стаяў доўгі стол, засланы белым абрусам і ўсцяж застаўлены багатаю і разнастайнаю закускай, выпіўкай, пасудаю... Самае пачэснае і віднае месца на стале займала шынка, запечаная ў хлебным цесце. Па велічыні яна нагадвала добрую падушку і ляжала на адмысловым дзеравянным крузе, убраная сцяблінкамі бруснічніку і вянком з дзеразы... На стале красаваліся засмажаныя парасяты, скруткі каўбас, мяса розных гатункаў, пара індычак, бабкі, мазуркі і цэлая горка афарбаваных яечак» [3, с. 574]. Аналагічным быў велікодны стол у пана падлоўчага Баранкевіча. Ён, пісаў Я. Колас, «быў завалены пірагамі, бабкамі, мясам розных гатункаў і рознага прыгатавання. Штук шэсць шкляных банак з крэпкім хрэнам выглядалі з розных месцаў стала, тры «буслы» гарэлкі высока падымалі галовы над статусамі закусак. Шынкі, як падушкі, абтыканыя зелянінаю, ляжалі важна зялёнамі ўзгоркамі» [3, с. 146]. Багатым быў велікодны стол і ў сям'і лесніка Міхала: «Ляжала шынка, як кадушка, / Румяна-белая пампушка... / Кілбасы-скруткі, як падковы, / Між сцёган, сала і грудзінак / Красуе ўсмажаны падсвінак» [2, с. 237]. Абавязковы атрыбут велікоднага пачастунку – пірог: «...пірагі, як сонца, ззялі, / І ў роце бабкі раставалі» [2, с. 237].

### Энергетычны патэнцыял выказванняў

З тэкстаў мастацкіх твораў Якуба Коласа бачна, што ў святочнай культуры беларусаў вялікую ролю адыгрывае слова. Святочнае дзеянне заўсёды суправаджалася ўключэннем энергетычнага патэнцыялу выказванняў літаратурных персанажаў. На думку стваральніка, з дапамогай слова ў рознай форме (песні, прытчы, казкі, загадкі, святочныя пажаданні, малітвы і інш.) чалавек кантактаваў з Богам, святымі, памерлымі продкамі, навакольнай прыродай. Асабліва ўважліва Якуб Колас адбіраў моўны матэрыял пры абмалёўцы святочных падзей і характарыстыцы ўдзельнікаў свята. Сваякі Міхала, настаўнікі вёскі Мікуцічы падчас Вялікадня спяваюць «Вэсолы»: «А гаспадар усе болей з баса / Уткне такога выкрунтаса, / Аж сам падзівіцца сабе» [2, с. 236–237]. Велікодныя псалмы спявалі таксама сем'і сваякоў Міхала ў Свержані, куды Міхал і Антось прыехалі, каб асвянціць святочныя стравы: «У Яўхіма дзядзькі, у Базылевых, / Таксама ў Стасечкі і Даткі / Свае захоўвалі парадкі: / Сядзелі згодна і набожна / І спеў святы вялі заложна / Вачэй не зводзячы з кантычкі» [2, с. 233–234]. Функцыянальную накіраванасць маюць у коласаўскіх творах святочныя пажаданні, з якімі звяртаюцца да прысутных літаратурныя героі падчас застолля. Удзельнікі свята жадаюць адзін аднаму здароўя, даўгалецця, не ведаць гора і смутку. Пажаданні напоўнены спадзяваннямі на добры ўраджай, багаты прыплод хатняй жывёлы, прыбытак у гаспадарцы. Так, Міхал падчас велікоднага снядання жадае членам сваёй сям'і: «Дай, божа, за год дачакаць / Здаровым, вясёлым, жывым /

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І новы вялікдзень таксама спаткаць / У добрым здаровейку ўсім, / Каб гора і смутку не зналі. / – Дай божа! – разам адказалі» [2, с. 237].

За часы святкавання Вялікадня ў беларусаў склаўся звычай валачобніцтва, калі на першы дзень свята моладзь абыходзіла хаты і віншавала гаспадароў песнямі, пажаданнямі шчасця сям'і, зычыла дабрабыту ў гаспадарцы. Колас у трылогіі «На ростанях» адзначаў, што «на Вялікдзень звычайна ў госці не запрашалі, хто хацеў, прыходзіў сам. Такі быў звычай, заведзены дзядамі і прадзедамі» [3, с. 574]. Такімі гасцямі часцей за ўсё былі гурты валачобнікаў, якія складаліся з некалькіх чалавек (7–12). Колас пісаў: «Не меней дванаццаці маладых настаўнікаў, зволеных са школ, паз'язджаліся ў Мікуцічы святкаваць Вялікдзень... На першы дзень Вялікадня настаўнікі ўсёй шумнаю грамадою рушылі ў Панямонь аддаваць велікодныя візіты мясцовым інтэлігентам» [3, с. 369]. Па традыцыі валачобнікі абіралі пачынальніка, які звычайна вітаў гаспадароў трохразовым «Хрыстос уваскрос!» і пытаўся дазволу «дом засяліць». Астатнія ўдзельнікі абраду падхоплівалі песню або спявалі прыпеў. Нярэдка валачобнікі рабілі імправізацыі на ўсталяваны рэлігійны змест песні, уводзілі крыху жартаўлівыя радкі, якія характарызавалі адметныя якасці асобы гаспадара. У трылогіі пісьменнік з адметнай для яго жартаўлівасцю стварыў малюнак валачобніцтва. Настаўнікі, літаратурныя персанажы трылогіі, склалі валачобную песню, якая спалучала рэлігійны і свецкі змест і была персаніфікавана. Гурт у якасці пачынальніка абраў настаўніка Андрэя Лабановіча, які пачынаў песню словамі: «Ходзяць валачобнікі без дарог... / Яны не шкадуюць ні горла ні ног» [4, с. 570]. Астатнія гурткоўцы падхоплівалі прыпеўку: «Памагай, божа, / Прыспрыяй, божа, – / Хрыстос васкрос, / Сын божы». Улічылі валачобнікі ў песні асобасныя якасці гаспадароў, чые двары яны наведвалі: «Прывітанне ў хату вам, дзядзька Тарас! / Не шкадуй гарэлкі нам і кілбас!», «Жыві і красуйся, Трайчанскі Базыль! / Вісяць каля Надзенькі, як матыль», «У Кузьмы Скаромнага дом, як сад. / Нібы майскіх кветак нарасло дзяўчат» [3, с. 571]. Заканчвалася песня ў коласаўскіх валачобнікаў велічаннем панямонцаў: «Што ж? Канчаем песню, бо канчаць пара. / Добрым панямонцам выгукнем – ура!» [3, с. 571]. Пасля такіх святочных пажаданняў валачобнікаў запрашалі за святочны стол, які звычайна перад гэтым ладзілі многія гаспадары, або адорвалі рознымі пачастункамі. З гэтай мэтай валачобнікі абіралі механошу, які выконваў функцыю зберагальніка пачастункаў. Старадаўнія звычаі валачобніцтва, святочных рытуалаў і абрадаў паступова адраджаюцца ў нашы дні, і коласаўскія творы – багатая крыніца ведаў па арганізацыі святочных імпрэз.



Падсумоўваючы вышэйсказанае, адзначым, што ў духоўнай спадчыне Якуба Коласа адлюстраваны шматлікія элементы рэлігійнай святочнай культуры беларускага народа. Па тэкстах мастацкіх твораў пісьменніка рассыпаны яркія, самабытныя апісанні святкавання Вербніцы, Уводзін прасвятой Багародзіцы, Юр'я, Міколы, Каляд і інш. Якуб Колас трактаваў святы як канцэнтрацыю жыцця, вынік працы, творчай дзейнасці чалавека, яе плёну. Усе атрыбуты свята, на думку мастака, ствараліся розумам і рукамі чалавека, у святочных абрадах і рытуалах яны набывалі сакральнае значэнне. Наогул рэлігійна-сакральны кантэкст прысутнічае ў мностве твораў Якуба Коласа даволі прыкметна. Трансцэдэнтная прысутнасць вобраза і імя Бога ў тэкстах пісьменніка, на нашу думку, характарызуе рэлігійна-філасофскі погляд яго самога на ўзаемасувязь Чалавека і Неба.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Бахтин, М. М.** Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин. – М.: Искусство, 1979. – 423 с.
2. **Колас, Я.** Новая зямля: паэма / Я. Колас. – Мінск: БФК, 2002. – 904 с., 91 л. іл.
3. **Колас, Я.** На ростанях: трылогія / Я. Колас. – Мінск: Дзярж. вучэб.-пед. выдавецтва Мін-ва асветы БССР, 1958. – 697 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ